# РАЗВІЦЦЁ ЧЫТАЦКІХ ІНТАРЭСАЎ У МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА «ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ»)

Галубоўская Наталля Аляксандраўна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Мэта даследавання** – выявіць і ахарактарызаваць умовы развіцця чытацкіх інтарэсаў малодшых школьнікаў сродкамі вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне».

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Задачы:

1. раскрыць сутнасць паняцця «чытацкі інтарэс», вызначыць фактары развіцця чытацкіх інтарэсаў;

2. выявіць дыдактычны патэнцыял падручнікаў па літаратурным чытанні для развіцця чытацкіх інтарэсаў малодшых школьнікаў;

3. вызначыць эфектыўныя метады і прыёмы развіцця чытацкіх інтарэсаў малодшых школьнікаў на ўроках літаратурнага чытання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Аб’ектам** даследавання выступае працэс развіцця чытацкіх інтарэсаў малодшых школьнікаў.

**Прадметам** даследавання з’яўляюцца ўмовы і спосабы стымулявання чытацкіх інтарэсаў малодшых школьнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Метады даследавання:

- вывучэнне псіхолага-педагагічнай літаратуры па праблеме даследавання;
- педагагічнае назіранне;
- аналіз вучэбна-метадычнага забеспячэння працэсу навучання малодшых школьнікаў літаратурнаму чытанню.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ГЛАВА 1. ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСНОВЫ РАЗВІЦЦЯ ЧЫТАЦКІХ ІНТАРЭСАЎ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ ПРЫ НАВУЧАННІ ЛІТАРАТУРНАМУ ЧЫТАННЮ

1.1. Сутнасныя характарыстыкі паняцця «чытацкі інтарэс»

1.2. Асаблівасці развіцця чытацкага інтарэсу малодшых школьнікаў на розных этапах навучання літаратурнаму чытанню

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Фарміраванне чытацкіх інтарэсаў прыцягвала ўвагу многіх вучоных: К.Д.Ушынскі, В.П.Вахтэраў, П.А.Афанасьеў і інш., асабліва неабходна адзначыць работу ў гэтым накірунку Н.М.Святлоўскай і А.У.Джэжалей. Аднак ***пытанне аб педагагічных умовах фарміравання чытацкіх інтарэсаў*** ні ў адным даследванні не ставілася і не рашалася, хоць у **практыцы навучання актуальнасць гэтай праблемы папаранейшаму высокая.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У вузкім сэнсе *інтарэс да чытання* – жаданне і неабходнасць узнаўлення сэнсу чужога маўлення па яе пісьмовай форме: цікавасць да механізму прачытвання, да пераводу надрукаваных знакаў у гукі і асэнсаванне гукавых комплексаў.
У шырокім сэнсе *чытацкі інтарэс* – гэта актыўныя адносіны чытача да чалавечага вопыту, які заключаны ў кнігах, і да сваёй здольнасці самастойна здабываць гэты вопыт з кніг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Вылучаюць 4 этапы чытацкай падрыхтоўкі малодшых школьнікаў:**

*падрыхтоўчы этап* (1 клас) – гэта этап навучання дзяцей чытацкай азбуцы;

*пачатковы* (2 клас) – этап мінімальнага літ.развіцця і спробы сіл у самастойным чытанні кніг;

*асноўны этап* (3 клас) – спроба выбіраць і чытаць патрэбныя і пасільныя кнігі, арыентуючыся на ўласныя чытацкія магчымасці, вопыт і чытацкую падрыхтоўку.

*заключны этап* (4 клас) – гэта этап фарміравання ў дзяцей пераваг у чытанні і цікавасці да кніг з улікам развіцця, умення самастойна працаваць з кнігай.

**<u>Гэтыя этапы адрозніваюцца</u>** вядучымі задачамі і ўмовамі навучання;структурай урока; вучэбным матэрыялам;аб'ёмам і зместам калектыўнай або індывідуальнай дзейнасці дзяцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ГЛАВА 2. МЕТАДЫЧНЫЯ АСНОВЫ РАЗВІЦЦЯ ЧЫТАЦКІХ ІНТАРЭСАЎ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ ПРЫ НАВУЧАННІ ЛІТАРАТУРНАМУ ЧЫТАННЮ

2.1. Дыдактычны патэнцыял падручніка па літаратурным чытанні для развіцця чытацкага інтарэсу малодшых школьнікаў

2.2. Узровень сфарміраванасці чытацкіх інтарэсаў у малодшых школьнікаў: вынікі вопытна-эксперыментальнай работы

2.3. Метады і прыёмы  развіцця чытацкіх інтарэсаў малодшых школьнікаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Работа па развіцці чытацкага інтарэсу малодшых школьнікаў ажыццяўляецца, у першую чаргу, сродкамі прадмета «Літаратурнае чытанне». Творы і заданні да іх спрыяюць развіццю чытацкага інтарэсу.

У адпаведнасці з узроставымі магчымасцямі вучні на ўроках літаратурнага чытання атрымліваюць элементарныя веды з вобласці літаратуразнаўства на практычным узроўні, узроўні ўяўленняў, якія неабходныя для засваення літаратуры як мастацтва слова і якія з'яўляюцца сродкам рашэння творчых задач, а таксама абслугоўваюць самастойную творчую працу маленькіх чытачоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Анкетаванне паказала**, што з 12 чалавек ў 4 класе 4 вучні маюць высокі ўзровень развіцця чытацкай цікавасці, 5 вучняў маюць нізкі ўзровень, 3 вучні на сярэднім узроўні. Навучэнцы выяўляюць недастатковую цікавасць да чытання ў цэлым, аднак выконваюць праграму, дадзеную на ўроках літаратуры. Разумеюць сюжэт твора літаральна, не арыгінальна, выконваюць заданні, але часта патрабуецца дапамога настаўніка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Для развіцця чытацкага інтарэсу малодшых школьнікаў існуе шэраг спосабаў узаемазвязнай дзейнасці педагога і навучэнцаў. Найбольш пашыраныя з іх: ***метад імітыцыі***; ***слоўнае маляванне***, ***слоўная гульня***, ***складанне псіхалагічнай літаратурнай характарыстыкі героя***, ***аналіз ілюстрацыі ў кнізе***, ***драматызацыі-спектаклі***, ***інсцэніроўкі***, ***складанне рэкламы або антырэкламы***, ***вядзенне дзённікаў чытача і інш***.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Фарміраваць чытацкі інтарэс у малодшых школьнікаў можна наступнымі шляхамі:**

а) ужыванне ў вучэбным працэсе метадаў, якія спрыяюць фарміраванню інтарэсу да чытання;

б) уключэнне элементаў даследавання ў розныя віды вучэбнай дзейнасці;

в) далучэнне да вынаходлівасці на ўроках і пазакласных занятках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Праведзенае даследаванне дазволіла зрабіць **наступныя вывады**:*

1. Чытацкія інтарэсы шмат у чым вызначаюць асобу чалавека, таму працэс фарміравання іх у малодшых школьнікаў мы разглядаем не толькі як педагагічную, псіхалагічную, метадычную, але і як сацыяльную праблему. Вырашальную ролю ў развіцці чытацкіх інтарэсаў малодшых школьнікаў адыгрывае максімальная апора на пазнавальную актыўнасць навучэнцаў, а таксама эмацыйную атмасферу навучання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Школьныя падручнікі садзейнічаюць развіццю чытацкіх інтарэсаў малодшых школьнікаў, аднак у першую чаргу настаўнік павінен улічваць асаблівасці развіцця чытацкіх інтарэсаў школьнікаў і выкарыстоўваць цікавыя формы працы, розныя метадычныя прыёмы, якія ставілі навучэнцаў перад неабходнасцю пошуку шляхоў самастойнага рашэння вучэбных задач.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Педагагічнае назіранне паказала, што выкарыстанне нетрадыцыйных, творчых формаў працы і адпаведных метадаў і прыёмаў не толькі робіць урокі цікавейшымі, але і стымулюе развіццё чытацкіх інтарэсаў малодшых школьнікаў і іх пазнавальнай актыўнасці.Цікавасць да чытання ўзнікае толькі ў ходзе правільна арганізаванай дзейнасці. Адказнасць за арганізацыю такой дзейнасці цалкам нясе настаўнік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# РАЗВІЦЦЁ ЧЫТАЦКІХ ІНТАРЭСАЎ  У МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА «ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ»)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Галубоўская Наталля Аляксандраўна